наасферы, разглядае сістэму экалагічнага выхавання: акрэслівае месца і ролі устаноў культуры ў гэтай сістэме.

Спецыяльная экалагічная падрыхтоўка з'яўляецца лагічным працягам у выглядзе прывіцця студэнтам праз курс "Арганізацыя экалагічных клубаў" канкрэтных навыкаў арганізацыі аматарскіх аб'яднанняў экалагічнага накірунку (клубы аматараў прыроды, аматараў хатніх жывел, птушак, кветак і г.д.), дзе ажыццяўляецца непасрэднае ўключэнне людзей у рэальную экалагічную дзейнасць.

Прапанаваная мадэль падрыхтоўкі арганізатараў экалагічнага руху ажыццяўлялася на працягу трох гадоў на кафедры самадзейнай творчасці, мела пэўны плён і сення неабходна яе далейшае развіццё праз укараненне ў новы вучэбны план "Мэнэджэр сацыя-культурнай сферы".

## ПЫТАННІ АДРАДЖЭННЯ БЕЛАРУСКАЙ КУЛЬТУРЫ Ў ДЗЕЙНАСЦІ КРАЯЗНАЎЧЫХ КЛУБАЎ І МУЗЕЯЎ

Т.М.Глінік

Адраджэнне нацыянальнай культуры, якое магчыма толькі на шляху дасягнення сапраўднага суверэнітэту Рэспублікі і дапамогі з боку урада, і якое мы назіраем ужо сення - складаны і шматпланны працэс. Гісторыя склалася так, што ўзнаўленне, а не знішчэнне нацыянальных каштоўнасцяў, зберажэнне і памнажэнне гісторыка-культурнай спадчыны вызначаюць творчую дзейнасць народа і яго імкненні "людзьмі звацца". Больш за шэсцьдзесят гадоў панавання сістэмы, якая мэтанакіравана уводзіла рускую мову і культуру ва ўсе сферы нашага жыцця, быў моцна падарваны духоўны патэнцыял беларускага народа. Але ж заўсёды былі людзі, асабліва мясцовыя жыхары, прадстаўнікі творчай і навуковай інтэлігенцыі, якія свядома супраціўляліся размыванню нацыянальных асноў, духоўных традыцый роднага краю. Зараз іх лік значна узрос, яны аб'ядноўваюцца у разнастайныя краязнаўчыя суполкі і клубы, адчыняюць грамадскія музеі, дзе увачавідкі, праз канкрэтныя рэчы, музейныя "каштоўнасці" імкнуцца "заняць свой пачэсны пасад між

народамі", стварыць неабходныя умовы духоўнага, інтэлектуальнага і эканамічнага развіцця грамадства.

Закон Рэспублікі Беларусь "Аб ахове і захаванні гісторыка-культурнай спадчыны", які быў прыняты ў канцы 1992 года, зацвярджае святы абавязак дзяржавы, кожнага яе грамадзяніна па ахове, захаванню, папулярызацыі і перадачы нашчадкам гісторыка-культурнай спадчыны. Выкананне гэтага закона, як і закона "Аб культуры у Рэспубліцы Беларусь", патрабуе пашырэння краязнаўчай дзейнасці, і яе разнастайных напрамкаў, калі мясцовыя жыхары на правах сапраўдных гаспадароў і нашчадкаў сваей мінуўшчыны рэалізуюць неад'емнае права самім вывучаць гісторыю і культуру сваей Бацькаўшчыны, сваей Беларушчыны. Гэтая дзейнасць павінна каардынавацца, у першую чаргу Беларускім краязнаўчым Таварыствам, а таксама шэрагам іншых: таварыствам беларускай мовы імя Ф.Скарыны, таварыствам народных майстроў, Асацыяцыяй фальклярыстаў і этнографаў і інш. "Самы масавы від навукі" (Д. С.Ліхачоў) - краязнаўства - выконвае пачэсную ролю: дапамагае захаваць сваю чалавецкую годнасць, непараўнальны нацыянальны менталітэт. Напрыклад, на занятках па краязнаўству студэнты падрабязней знаемяцца з гісторыяй беларускага краязнаўства, з вытокамі свайго роду (што азначае імя, прозвішча, назва месяца нараджэння, іншых геаграфічных і гістарычных асаблівасцей), авалодваюць навыкамі арганізацыі турыстка-экскурсійнай дзейнасці, а таксама музеяў на грамадскіх пачатках. У Ш групе створана аб'яднанне аматараў беларускай культуры, сярод шматлікіх задач яго дзейнасці падкрэслім наладзіць сяброўства з селета народжаным нацыянальным згуртаванне у Расіі - студэнцкай моладзежнай "Пагоняй", якая аб'яднала беларускіх юнакоў і дзяўчат. Згодны атрымання у Маскве юрыдычнага статуса адбылося вялікае свята, спонсарам якога выступіў генеральны дырэктар акцыянернага таварыства "Кросны" Ян Грыб. Нашы студэнты Умоўна" прынялі удзел у незвычайнай экскурсіі "Масква беларуская", якую правеў малады мінскі навуковец Г.Прыбытка. На шматлікіх маскоўскіх вуліцах і завулках шмат памятных месцін, будынкаў, звязаных з жыццем Янкі Купалы і Якуба Коласа, Уладзіміра Караткевіча і Уладзіміра Дубатоўкі, іншых выдатных дзеячаў культуры, навукі, мастацтва, а таксама народнай творчасці, якія зрабі і прыгожыя архітэктурныя ансамблі, хараство беларускай разьбы, пазалоты,

РЭПОЗІТОРЫЙ БГУКІ

кавальства і кафлі.

"Звышзадачай" дзейнасці краязнаўчых аб'яднанняў і суполак з'яўляецца адкрыццё грамадскага музея, профіль якіх у Беларусі самы разнастайны. У апошнія гады павялічваецца колькасць музеяў, звязаных з адраджэннем народных рамёстваў і промыслаў, свят і абрадаў. На наш погляд, паспела неабходнасць адкрыцця музея ў Мінскім інстытуце культуры, які ў перыяд беларусізацыі і культурнага адраджэння адыграе вялікую ролю ў падрыхтоўцы кваліфікаваных спецыялістаў у галіне культуры.

## ПРАБЛЕМЫ РАЗВІЦЦЯ БЕЛАРУСКАГА АКВАРЭЛЬНАГА МАСТАЦТВА

У.Рынкевіч

У марфалогіі выяўленчага мастацтва акварэль займае месца водападзела паміж графікай і жывапісам. Гэта - самастойны від мастацтва (у яго паўсядзенным, а не навуковым азначэнні), у якім разам з агульнымі правяць свае асабістыя законы мастацкай вобразнасці. Спецыфіка выразных сродкаў акварэлі надае ей невычэрпную стваральную сілу і непаўторнасць фактуры мастацкага вобраза, дазваляе ей выжываць і удасканальвацца ў бяслітасным працэсе эвалюцыі мастацтва.

Акварэль мае глыбокія карані ў беларускім мастацтве, але як самастойны, арганізаваны рух акварэль існуе з сярэдзіны 1960-х гадоў. "Акварэльны бум", як ахрысцілі мастацтвазнаўцы масавае захапленне акварэллю, прыходзіцца на пачатак 70-х. У межах савецкага мастацтва яго прадвызначылі наяўнасць моцных акварэльных цэнтраў (Масква, былы Ленінград, сталіцы Прыбалтыкі) і невыкарыстаны патэнцыял выразных сродкаў самага матэрыяла. Вехамі ў развіцці мастацтва акварэлі былі цыклічныя, з перыядам у тры-чатыры гады, выстаўкі розных узроўняў. На працягу многіх гадоў ролю галоўнай рухавай сілы, якая ствярала ўмовы росту майстэрства і давала аснову галоўным акварэльным вернісажам, выконвалі ўсесаюзныя творчыя групы мастакоў-акварэлістаў, як іх называлі тады, "творчыя акадэміі". З'ява гэтая вельмі неардынарная нават для сусветнай мастацкай практыкі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ